УДК 821.161.3

**Т. Р. Бруцкая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ПІСЬМЕННІКІ XIX СТАГОДДЗЯ Ў ЛІТАРАТУРНА-КРЫТЫЧНЫХ АРТЫКУЛАХ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**Уводзіны.** Новая беларуская літаратура, станаўленне якой прыпадае на другую палову XVIII — XIX стагоддзе, заклала трывалы падмурак для развіцця класічных асноў літаратуры на пачатку XX стагоддзя, які традыцыйна характарызуецца як перыяд нацыянальнага адраджэння. Асабліва значны ўклад у беларускую крытыку і навуковую думку ўнёс Максім Багдановіч, які лічыцца адным з заснавальнікаў беларускага нацыянальнага літаратуразнаўства.

Шматгранная творчая спадчына Максіма Багдановіча — гэта сведчанне магутнага таленту, якім быў адораны мастак. Багдановіча-крытыка найперш цікавіла творчая індывідуальнасць мастака. Гэта абумоўлівалася разуменнем таго, што духоўныя каштоўнасці ствараюцца ўнутры кожнай асобы, а не ўкараняюцца звонку, яны натуральна выяўляюцца ў творчым працэсе. Да асэнсавання заканамернасцей развіцця літаратуры, яе ўнутраных законаў, узаемадзеяння зместу і формы М. Багдановіч ішоў праз аналіз канкрэтных твораў, праз спасцігжэнне самабытнасці індывідуальнага свету творчай асобы. Даследчык «напрамую» выводзіў абумоўленасць стылю мастацкім метадам, агульнымі прынцыпамі засваення рэчаіснасці, падкрэсліваў залежнасць стылю ад характару творчай індывідуальнасці пісьменніка, яго светапогляду і асаблівасцей мастацкага таленту.

**Асноўная частка.** Максім Багдановіч працягвае ідэйна-эстэтычную канцэпцыю, якую распрацавалі паэты XIX стагоддзя (В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, В. Каратынскі). Іх мастацкая спадчына цікавіла пісьменніка. Сведчанне гэтаму — літаратурна-крытычныя артыкулы «І. Неслухоўскі», «За сто лет», «Белорусское возрождение», «Забыты шлях». Малады крытык адзначаў: «Пішучы па-польску, апошнія імкнуліся ў сваіх творах раскрыць дух народа, яго маральныя і эстэтычныя каштоўнасці. Як вядома, беларуская мова ў XIX стагоддзі мела “паўлегальнае” становішча. Але гэтага не дастаткова, каб абгрунтаваць значную перавагу польскамоўнай літаратуры. Мяркуецца, што ёсць і іншыя падставы: па-першае, паэты былі апантаныя жаданнем адкрыць свету беларуса, яго характар, культуру, ідэалы, а гэта трэба было рабіць у форме літаратурнай мовы, г. зн. польскай; па-другое, адкрыць селяніна айчыннай інтэлігенцыі, якая таксама трымалася польскамоўных форм праяўлення культурнага жыцця» [2, с. 93].

Максім Багдановіч імкнуўся абгрунтаваць узнікненне новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя з пазіцый культурна-гістарычнай школы: «Адраджэнне беларускай пісьменнасці належыць да першых гадоў XIX сталецця, калі паміж нашай краёвай шляхты патроху пачала выраблягца інтэлігенцыя. …Гэтая завіруха збудзіла ў многіх людзей, найбольш са спольшчанай шляхты, пачуццё грамадзяніна, пачуццё любові да роднай старонкі; старонкай жа гэтай для іх была не Варшаўшчына, не Кракаўшчына, а наша беларуская зямля» [2, с. 208—209].

Багдановіч робіць агляд беларускай літаратуры XIX стагоддзя: «Возникла на почве местного “патриотизма” особая “краевая” литература, главным образом польская» [2, с. 265]. Вяршыняй яе ён лічыць паэму Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш», сярод найбуйнейшых пісьменнікаў называе Чачота, Баршчэўскага, Рыпінскага. «Предметом “краевой” литературы являлось описание Белоруссии, белорусской природы, белорусского крестьянства и мелкой шляхты, их повседневной жизни и обычаев» [2, с. 266]. У гэтыя апісанні, заўважае М. Багдановіч, нярэдка траплялі творы беларускага фальклору, а таксама народная гутарковая мова. Найбольш каштоўны ўклад у беларускую літаратуру, на думку М. Багдановіча, унёс Ян Чачот: «Искренний демократ, горячо любивший белорусский народ, он собирал и издавал произведения народного творчества, писал по-белорусски морализующего характера брошюрки, а в сборнике “Piosnki wieśniacze z-nad Niemna” 1845 г. поместил десятка три своих белорусских стихотворений, написанных в подражание народным песням» [2, с. 267]. Завяршаецца, на думку аўтара артыкула, перыяд «краёвай» літаратуры беларуска-польскай «Ідыліяй» В. Дуніна-Марцінкевіча. Трэба адзначыць, што М. Багдановічам упершыню ў XX стагоддзі быў уведзены «фенаменальны» тэрмін — «краёвая» літаратура, які і цяпер актыўна ўжываецца даследчыкамі, бо ў ім закладзены адметнасці развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства. Тэрмін «краёвая» літаратура дае падставу адмяжоўваць мясцовых аўтараў ад уласна польскай літаратуры [1, с. 10].

Асобнае месца ў літаратурным працэсе займае постаць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які сваімі творамі («Гапон», «Вечарніцы» і інш.) значна развіваў беларускую літаратуру. Беларускамоўныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча адрасаваны селяніну: «Гапон» абуджаў у працаўніка веру ў чалавечую годнасць, «Вечарніцы» і «Купала» раскрывалі каштоўнасць народнага жыцця, традыцый, красу душы, трываласць маральных норм у прадстаўнікоў сялянства. Багдановіч сцісла падае жыццяпіс пісьменніка, пералічвае яго творчыя набыткі пасля «Ідыліі» — «целый ряд белорусских поэм», аднак крытыкуе аўтара за мастацкую

© Бруцкая Т. Р., 2017



Рэпазіторый БарДУ

недасканаласць: «Писатель грузный и тяжеловесный, сосредоточившийся исключительно на эпосе, Марцинкевич писал стихом неизящным и неповоротливым, сплошь отступающим от требований белорусской просодии (влияние польских образцов). Можно даже сомневаться, был ли он вообще поэтом... Однако заслуги Марцинкевича перед белорусской литературой лежат все же не в области художественных достижений, а в области чисто исторической. Они в том демократизме, который веял от сентиментально-народнических поэм Марцинкевича, в той гуманизаторской тенденции, которая явственно проступает из каждой строки... Наконец, ...много писав и много печатая, он возбуждал вокруг своих произведений разговоры и полемику, напоминая о существовании белорусского языка и зародышей белорусской литературы, наводил на вопрос о возможности их дальнейшего развития» [2, с. 269]. У ацэнцы, дадзенай М. Багдановічам Дуніну-Марцінкевічу, ёсць супярэчлівасць: з аднога боку, гэта буйны талент, які ўплываў на развіццё літаратуры, быў «цэнтрам пісьменніцкага кружка», з другога — недасканалы майстра.

Шэраг крытычных прац М. Багдановіча прысвечаны літаратуры XIX стагоддзя, якую ён успрымаў як натуральны працяг літаратуры старажытнасці. Сярод іх — «І. Неслухоўскі» — няскончаны артыкул, прысвечаны Янку Лучыне, датуецца 1910—1911 гадамі. Аўтар гаворыць аб малой колькасці твораў паэта і неспрыяльнай літаратурнай сітуацыі 80—90-х гадоў XIX стагоддзя, аднак падкрэслівае факт ажыўлення «нацыянальнага самапачуцця», разам з якім «пачала аджываць і замершая лет на 15 беларуская пісьменнасць: перадрукоўваўся Марцінкевіч, з’явілася колькі ксёнжачак Ельскага, пераклад гаршынаўскага апавядання “Сігнал”, вершы Бурачка, Каганца, Шункевіча і інш.» [2, с. 183].

Яшчэ адзін артыкул М. Багдановіча — «Булгарин в белорусской шуточной поэме» — быў напісаны ў 1914 годзе для яраслаўскай газеты «Голос». У ім дадзена даволі высокая ацэнка паэмы, якая, на думку аўтара, «во многих местах полна хоть и не очень тонким, но живым и неподдельным юмором, речь её достаточно колоритна и чиста, стих — бойкий, льющийся непринуждённо, вся поэма в целом — беспретенциозна и, между прочим, довольно литературна» [2, с. 254—255]. Пра аўтара, тады яшчэ невядомага, М. Багдановіч гаворыць, што гэта быў «человек русской культуры». Крытык лічыць найбольш цікавым у сюжэце выпад «человека русской культуры» супраць Булгарына і Грэча, «сделанный даже в скромной белорусской литературе» [2, с. 254—255]. Такі акцэнт, магчыма, быў зроблены таму, што М. Багдановіч пісаў для рускай газеты і лічыў, што гэта выкліча цікавасць да паэмы з боку рускага чытача [1, с. 9].

Сярод іншых пісьменнікаў XIX стагоддзя М. Багдановіч вылучае У. Сыракомлю як найбуйнейшага па сіле таленту, В. Каратынскага, А. Вярыгу-Дарэўскага, Я. Францішка Вуля, Ю. Ляскоўскага і інш. Станоўча ацэньвае паўстанцкую публіцыстыку 1860-х гадоў — «Мужыцкую праўду», «Гутарку старога дзеда», «Перадсмертны разгавор пустэльніка Пятра». Багдановіч назваў нямала новых імёнаў пісьменнікаў канца XIX стагоддзя: Хвэлька з Рукшэніц, віцябчанін (Фелікс Тапчэўскі), называе яго верш «Гаспадыня», сёння невядомы даследчыкам.

Максім Багдановіч падрабязна спыняецца на постаці Ф. Багушэвіча: у 1891 годзе выйшла кніга вершаў Мацея Бурачка «Дудка беларуская», а ў 1894-м — зборнік Сымона Рэўкі «Смык беларускі»; «и то и другое принадлежало перу интересного белорусского деятеля Францишка Богушевича» [2, с. 267]. Далей М. Багдановіч падае ў цэлым дакладныя звесткі з яго жыццяпісу. Цікавай з’яўляецца характарыстыка творчасці Ф. Багушэвіча: «Его произведения, глубоко проникнутые национальным и демократическим духом, не блещут изяществом отделки, но зато отличаются большой энергией выражения. Стих его прост и суров; изредка эта суровость сменяется юмором» [2, с. 273]. Багдановіч падкрэсліў важную ролю прадмоў да кніг, у якіх, як ён лічыць, Ф. Багушэвіч з’явіўся першым «проповедником всестороннего национального возрождения белорусов, доказывая, что они представляют отдельный, самостоятельный народ» [2, с. 273].

«У сваіх ацэнках беларускай літаратуры пачатку XIX стагоддзі М. Багдановіч не пагрэшыў супраць гістарычнай праўды, не перабольшыў заслуг тых, перш за ўсё польскіх, пісьменнікаў, вучоных-археолагаў, гісторыкаў, этнографаў, якія шчыра ставіліся да справы адраджэння беларускай пісьменнасці. Ён з удзячнасцю гаворыць пра ўсіх прыхільнікаў беларускага народа. Сярод тых, чые заслугі перад Беларуссю высока ацэньваюцца М. Багдановічам, — Зянькевіч, браты Тышкевічы, Кіркор, Нарбут, Ярашэвіч, Даніловіч, Ліндэ, Чарноўская, Шыдлоўскі, Фалютынскі, Мухлінскі. “На старонках журналаў пачалі з’яўляцца беларускія казкі і песні, у апавяданнях з краёвага жыцця ўвесь час спатыкаліся беларускія выразы, іншы раз гутаркі дзе-якіх асоб пераказваліся нават цалкам па-беларуску, а адсюль ужо недалёка і да чыста беларускіх твораў”» [3].

**Заключэнне.** Павышаная ўвага даследчыкаў да нацыянальнай своеасаблівасці літаратуры, да вуснай народнай творчасці, да фальклорных жанраў узгадавана, як мы ўжо бачылі, культурна-гістарычнай школай. Максім Багдановіч у сваім артыкуле змадэляваў шлях перспектыўнага развіцця нацыянальнай літаратуры, даў яго тэарэтычнае абгрунтаванне.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Максім Багдановіч — празаік, крытык, публіцыст : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29 ліст. 2005 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; уклад. І. В. Мышкавец. — Мінск : РІВШ, 2006. — 124 с.

2. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — Т. 2 : Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. — 600 с.

3. Навуковая і літаратурна-крытычная спадчына М. Багдановіча [Электронный ресурс] // Сайт Максима Богдановича. — Режим доступа: http://www.maksimbogdanovich.ru/stories/249-page-5.htm . — Дата доступа: 01.11.2016.



Репозиторий БарГУ